ЖАНЧЫНЫ-МЕДЫКІ: РАБОТА, ВЫЗНАЧАНАЯ ЛЁСАМ 4

МАЛАДЗЕЧНА: СЛЯДЫ ДАЎНІНЫ 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 САКАВІКА 2022 г. СЕРАДА № 46 (29668)

ЗІМЫ ФІНАЛЬНЫЯ АКОРДЫ

ЖЫХАР вёскі Вялікі Поўсвіж Лепельскага раёна Васіль ШКІНДЗЕР толькі ў пяцьдзясят гадоў асвоіў скрыпку і з задавальненнем удзельнічае з іншымі музыкамі і спевакамі ў танцавальных вечарынах і этнаграфічных святах. Звычайна ігры на «каралеве аркестра» вучацца з маленства і да таго ж не адзін год засвойваюць музычную грамату, адточваюць тэхніку. Я не стрымаўся, каб не запытаць у поўсвіжскага скрыпача, чаму так позна ён прыйшоў да свайго захаплення. Не таму, відаць, што захацеў здзівіць свет? Васіль падзяліўся ўспамінамі.

— Можна сказаць, іграць на скрыпцы — мара з дзяцінства. Было ад сілы чатыры гадкі, калі я першы раз убачыў сапраўднага скрыпача, гэта быў вясковы сівы дзядок (мой бацька часта запрашаў паіграць у нашым дварэ). Дзядок сядаў на ганак, браў у рукі свой маленькі інструмент і іграў розныя мелодыі: і вясёлыя, і сумныя. Цікава, да дзясятага класа я не чуў жывую скрыпічную музыку, а тая музыка, што гучала з радыё альбо тэлевізара, мяне не надта кранала. Пакуль у нашу школу не прыехалі артысты з філармоніі. У аркестры была скрыпачка, яна так добра іграла, што я паўтары гадзіны ашаломлена глядзеў на рухі яе рук і пальцаў, слухаў мелодыю, якую яна выводзіла. Тады і загарэўся музыкай.

Васіль па адукацыі настаўнік фізікі і матэматыкі, скончыў Віцебскі педагагічны ўніверсітэт, працаваў у вясковай школе. Калі ў нашай краіне пачаўся аграсядзібны рух, ён адзін з першых стварыў сваю аграсядзібу — з ухілам на адраджэнне фальклорных свят. Потым навучыўся іграць на дудзе — старажытным інструменце, быў першым дударом на азёрнай Лепельшчыне. І нарэшце, вярнуўся да сваёй дзіцячай мары: набыў скрыпку і стаў вучнем дзіцячай школы мастацтваў. Вывучыў ноты, навучыўся трымаць смык, вібрыраваць на струнах. І вось ужо дзесяць гадоў Васіль Шкіндзер са сваёй скрыпкай прыходзіць і на «Жаніцьбу Цярэшкі», і на «Гуканне вясны», і на Купалле, каб гучала жывая народная музыка.

На гэтым здымку — музыкант на падворку сваёй аграсядзібы.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Тэхналагічнае і інфармацыйнае развіццё грамадства цягне за сабой непазбежнае змяненне ролі мужчыны і жанчыны ў сучасным свеце. Жанчыны сёння ўзначальваюць буйныя кампаніі, робяць навуковыя адкрыцці, становяцца вядомымі і ўплывовымі палітыкамі. Выраз «слабы пол» у адносінах да жанчын даўно ўжо страціў актуальнасць. Пры гэтым найважнейшую ролю ў жыцці беларусак займае сям'я, дзеці, а знаходзіць баланс паміж кар'ерай і сям'ёй дапамагае дзяржава. Стабільна забяспечваецца падтрымка сем'яў пры нараджэнні дзяцей, растуць дзяржаўныя дапамогі. Дзяржава, аказваючы паслугі па доглядзе дзяцей у дзіцячых садках, стварае жанчынам умовы для рэалізацыі ў прафесіі».

КАРОТКА

- **Тавараабарот паміж Расіяй і Беларуссю ў 2021 годзе вырас на 34 працэнты.**
- Пробнае тэсціраванне па адзіным экзамене, які ўводзіцца ў Беларусі з 2023 года для выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, гімназій і ліцэяў, можна прайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.
- **Міністэрства аховы здароўя: ва ўсіх абласцях Беларусі зніжаецца захваральнасць COVID-19 сярод дзяцей і дарослых.**
- Санкцыі супраць Расіі абярнуліся ростам цэн у Еўропе.

ЛАМАЕЦЦА ТАМ, ДЗЕ ТОНКА

Як не праваліцца пад лёд і што рабіць, калі вы ўсё-такі апынуліся ў вадзе?

Ну, пра што, прабачце, думаюць дарослыя людзі, калі выходзяць на лёд пры плюсавай тэмпературы паветра?! Няўжо радасць ад выцягнутай з лункі рыбіны вартая таго, каб так рызыкаваць уласным жыццём?! Быццам і не дзеці ўжо, а пра элементарныя правілы бяспекі некаторыя аматары зімовай рыбалкі, на жаль, забываюць. Ці можа, не ведаюць?

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2022 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«З КОЖНЫМ ГОДАМ СПАРТСМЕНЫ РЫХТУЮЦЦА ЎСЁ ЛЕПШ»

У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» ў мінулую суботу прайшло рэспубліканскае зімовае свята «Мінская лыжня — 2022». Больш за 50 каманд правяралі свае сілы ў біятлонных эстафетах 4х2. Сярод іх і каманда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На старт таксама выйшлі каманды Адміністрацыі Прэзідэнта, Апарату Савета Міністраў, Парламента, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Выканаўчага камітэта СНД, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і іншыя.

Фота БелТА.

Каманда кіраўніка дзяржавы першай прыйшла да фінішу ў эстафетнай гонцы. У складзе каманды, акрамя Аляксандра Лукашэнкі, выступілі таксама Святлана Канашэнка, Людміла Калінчык і Мікалай Лукашэнка. Каманда Прэзідэнта паказала выдатны вынік на агнявых рубяжах, закрыўшы 40 з 40 мішэняў. Таму дыстанцыю каманда пераадолела без штрафных кругоў.

Варта адзначыць, што каманда кіраўніка дзяржавы выступала па-за конкурсам. Першае прызавое месца з трыма промахамі заняла каманда Віцебскага аблвыканкама. Другое заліковае месца ў каманды Камітэта дзяржаўнага кантролю. На трэцім месцы — прадстаўнікі Брэсцкага аблвыканкама. Заслужаныя ўзнагароды пераможцам уручыў асабіста кіраўнік дзяржавы. Пасля гэтага беларускі лідар сустрэўся з журналістамі і падзяліўся сваімі ўражаннямі.

«З пункту гледжання гатоўнасці ўсё ідэальна. Надвор'е Бог падарыў. Прэтэнзій ніякіх няма. І павінен сказаць, што з кожным годам спартсмены рыхтуюцца ўсё лепш і лепш», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы пагадзіўся з журналістамі і заўважыў, што на Захадзе глядзяць беларускія мерапрыемствы і разумеюць, што канкурыраваць з беларусамі немагчыма. «Усё было сумленна. Мінус тры працэнты не было. Усе беглі на вачах у людзей, хто як мог. Таму яны правільна робяць, што не жадаюць з намі канкурыраваць. Яны ведаюць, як у народзе кажуць, справа дрэнь, кепска для іх скончыцца», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі цікавілі не толькі спартыўныя пытанні. У прыватнасці, беларускі лідар расказаў пра рэалізацыю беларускіх праектаў на Балтыцы. Раней Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін даў даручэнне дапамагчы развіццю беларускіх праектаў у гэтым рэгіёне. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што гаворка ідзе пра будаўніцтва партовай гаспадаркі. Беларусі неабходны свае парты. Беларускі і расійскі кіраўнікі дзяржаў абмяркоўвалі гэта пытанне яшчэ да спецаперацыі ва Украіне.

«У аператыўным парадку былі вызначаны месцы, месцы вельмі добрыя, мне ўжо далажылі. Разам паедзем, паглядзім, як там ідзе будаўніцтва. На працягу двух гадоў у нас там будуць парты, будзем грузіць свае грузы. Прэзідэнт Расіі мне сказаў, што любы беларускі праект яны падтрымаюць. Гэта было яшчэ да канфлікту. А зараз і Бог загадаў. Вы ж бачыце гэтыя вар'яцкія санкцыі супраць Расіі. І нас туды за кампанію, каб Расія не абышла санкцыі праз Беларусь. Ну, што тут скажаш, кошкі адпачываюць... Любы праект у любым месцы Расіі, іх ужо нямала, яны нас падтрымліваюць, а мы рэалізуем, таму пацерпім. А далей убачыце: яны да нас прыйдуць і будуць прасіць прабачэння, каб мы з імі супрацоўнічалі», — канстатаваў беларускі лідар, маючы на ўвазе тых, хто сёння далучыўся да санкцый.

Таксама ў рамках «Мінскай лыжні — 2022» прайшлі спаборніцтвы аматарскіх каманд. У гэтым відзе турніру першай стала каманда падатковых органаў, на другім месцы — каманда аматараў «Джылі», на трэцім — прадстаўнікі Міністэрства адукацыі. Найлепшымі ў спаборніцтвах цэнтральных апаратаў сілавых міністэрстваў і ведамстваў стала каманда Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Дзяржаўны пагранічны камітэт. На старт таксама выйшлі каманды рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання да 100 чалавек. Пераможцамі стала Міністэрства спорту і турызму, на другім і трэцім месцы — Міністэрства культуры і Міністэрства прыродных рэсурсаў адпаведна. У турніры дзяржаўных органаў дзяржкіравання звыш 100 чалавек першымі да фінішу прыехала каманда Міністэрства па падатках і зборах, за ёй — каманды Нацыянальнага банка і Міністэрства адукацыі. На лыжню таксама выходзілі прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі і розных іншых арганізацый.

Упершыню «Мінская лыжня» прайшла 16 лютага 1986 года. Тады быў арганізаваны лыжны прабег на 15 км па маршруце Баравая — Раўбічы ўздоўж аўтамабільнай трасы Мінск — Віцебск. На старт выйшла 12 тысяч чалавек.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кітай заклікаў ЗША апублікаваць даныя аб ваенных біялабараторыях ва Украіне

МЗС КНР заклікаў ЗША апублікаваць даныя аб сваіх ваенных біялабараторыях ва Украіне і вірусах, якія там даследаваліся, паведаміла РІА «Навіны».

Пра гэта на рэгулярным брыфінгу заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Чжаа Ліцзянь. «Ваенныя біялагічныя праграмы ЗША на Украіне могуць быць толькі верхавінай айсберга. Пад маркай супрацоўніцтва для скарачэння біялагічных рызык у сферы бяспекі і абароны сусветнай аховы здароўя ЗША кантралююць 336 лабараторый у 30 краінах свету. Амерыканскі бок таксама ажыццяўляў мноства ваенных біялагічных даследаванняў у лабараторыі Форт-Дэтрык», — паведаміў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР. Як вядома, начальнік войскаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны РФ Ігар Кірылаў паведаміў аб тым, што ва Украіне сфарміравалася сетка з больш чым 30 біялагічных лабараторый у рамках ваенна-біялагічных праграм Пентагона. Паводле інфармацыі Міністэрства абароны Расіі, аб'ёмы фінансавання ЗША біялагічных лабараторый ва Украіне перавышалі $200 млн. Атрыманыя дакументы пацвярджаюць, што ў непасрэднай блізкасці ад тэрыторыі Расіі ажыццяўлялася распрацоўка кампанентаў біялагічнай зброі.

У Расіі зацвердзілі пералік недружалюбных краін

Урад Расіі зацвердзіў пералік замежных дзяржаў і тэрыторый, якія здзяйсняюць у дачыненні да РФ, расійскіх кампаній і грамадзян недружалюбныя дзеянні.



Як паведаміла прэс-служба ўрада, прэм'ер Міхаіл Мішусцін падпісаў адпаведнае распараджэнне. Згодна з дакументам, у пералік увайшлі дзяржавы — члены Еўрапейскага саюза, Аўстралія, Албанія, Андора, Вялікабрытанія (уключаючы востраў Джэрсі і падкантрольныя заморскія тэрыторыі — востраў Ангілья, Брытанскія Віргінскія астравы, Гібралтар), Ісландыя, Канада, Ліхтэнштэйн, Мікранезія, Манака, Новая Зеландыя, Нарвегія, Рэспубліка Карэя, Сан-Марына, Паўночная Македонія, Сінгапур, ЗША, Тайвань, Украіна, Чарнагорыя, Швейцарыя і Японія. Распараджэнне падрыхтавана ў рамках указа прэзідэнта РФ ад 5 сакавіка «Аб часовым парадку выканання абавязацельстваў перад некаторымі замежнымі крэдыторамі». Урад нагадвае, што, згодна з гэтым указам, расійскія грамадзяне, кампаніі, сама дзяржава, рэгіёны і муніцыпалітэты, якія маюць валютныя абавязацельствы перад замежнымі крэдыторамі з пераліку недружалюбных краін, могуць расплаціцца па іх у рублях.

Міністр эканомікі Францыі заклікаў жыхароў краіны знізіць выдаткі энергіі

Насельніцтву варта паспрабаваць знізіць выдаткі энергіі. З такой заявай выступіў французскі міністр эканомікі Бруна Ле Мэр.

Ён заявіў у эфіры тэлеканала BFM TV аб неабходнасці больш разумна расходаваць энергію ва ўмовах росту цэн на яе. Кошт газу ў Еўропе паскорыў рост, упершыню ў гісторыі перавысіўшы $3,9 тысячы за тысячу кубоў, аб чым сведчаць даныя таргоў. У цэлым расцэнкі з пачатку перадсвяточных таргоў павялічыліся больш чым на 79 %. Кошт нафты перавысіў $130 за барэль, паведаміла ТАСС. «Абсалютна відавочна, што адмова ад расійскай нафты прывядзе да катастрафічных наступстваў для сусветнага рынку. Усплёск цэн будзе непрадказальным — больш чым $300 за барэль, калі не больш», — адзначыў віцэ-прэм'ер РФ Аляксандр Новак.

Фінансы

Нашы рэзервы на ўзроўні і нават крыху вышэй

На пачатак сакавіка золатавалютныя рэзервы Беларусі склалі каля 8,3 мільярда долараў ЗША.

Такім чынам, па інфармацыі прэс-службы Нацыянальнага банка краіны, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, па папярэдніх даных, склалі 8 мільярдаў 264,6 мільёна долараў (у эквіваленце).

За люты гэтага года золатавалютныя рэзервы знізіліся на 259,2 мільёна долараў (на 3,0 %) пасля росту ў студзені на 98,8 мільёна долараў (на 1,2 %).

Зніжэнне ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў па выніках лютага ў асноўным абумоўлена плановым пагашэннем урадам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 280 мільёнаў долараў, а таксама адмоўным сальда куплі-продажу Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа».

Згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2022 год, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2023 года павінен скласці не менш як 7 мільярдаў долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Па-суседску

ЧУЛАСЦЬ НЕ СПЫТАЕ ПАШПАРТА

Прыклад душэўнага, самага неабыякавага стаўлення, спагады да чужой бяды гэтымі днямі паказалі мазырскія медыкі. Нядзельнай раніцай, 6 сакавіка, хірургічнае аддзяленне гарадской бальніцы ў экстранным парадку прыняло для аказання медыцынскай дапамогі грамадзянку Украіны і яе дачку-падлетка. Іх сям'я ва ўласным доме пацярпела ад рук марадзёраў. Жанчына атрымала агнястрэльнае раненне, а яе мужа, упэўненая сама грамадзянка Украіны, застрэлілі тыя, хто нападаў.

Як вядома, экіпаж хуткай дапамогі даставіў у Мазырскую гарадскую бальніцу параненую жанчыну і яе непаўналетнюю дачку з беларуска-ўкраінскай граніцы. Дзяўчынка не пацярпела, а яе маці мазырскія медыкі аказалі своечасовую дапамогу.

— Стан пацыенткі стабілізаваны. Яна будзе працягваць далейшае лячэнне ў нашай установе, — пракаментаваў сітуацыю журналістам **загадчык першага хірургічнага аддзялення Мазырскай гарбальніцы Віктар ЖУРАЎСКІ.**

Але за дакладнай і кароткай аператыўнай інфармацыяй стаіць вялікая і шчырая падтрымка пацярпелай сям'і мазырскімі медыкамі, не толькі як спецыялістамі, але і неабыякавымі грамадзянамі. У тую самую раніцу, калі маці і дачка паступілі ў аддзяленне, калектыў купіў і перадаў так неабходныя вымушаным бежанцам адзенне, гігіенічныя прылады, бытавыя рэчы. Як стала вядома, пакідалі свой дом і шукалі ратавання мама з дачкой з пустымі рукамі, літаральна ў дамашнім адзенні.

Наколькі ўкраінка ўдзячная гэтым «чужым» людзям, якія па волі абставін, сталі блізкімі, можна было даведацца з невялікага інтэрв'ю журналістам. Яно, безумоўна, каштавала параненай жанчыне намаганняў не толькі фізічных, але і маральных.

— Мы жывём з сям'ёй у Кіеве, але, калі ў чацвер сталі бамбіць, мы з'ехалі на дачу, думалі, там будзе больш бяспечна. У хаце ў нас не было святла, «Градамі» ж накрывалі, ракетамі рознымі, не было вады і ацяплення. Мы хадзілі да суседзяў набіраць ваду са студні. Муж сышоў і не зачыніў нас. Яго на вуліцы, не ведаем, марадзёры, хутчэй за ўсё, забілі, — апісала жыхарка Украіны трагічныя для яе сям'і падзеі 4 сакавіка. — У нас дзверы (у хаце. — **Заўв.**) браніраваныя, на зашчапцы, яны ўрываліся-ўрываліся, пачалі дзверы абстрэльваць, пашкодзілі замок, адкрыць не змаглі, пастралялі па шкле і ўвайшлі ў хату. Але толькі паглядзелі, што ў хаце. Мы з дачкой схаваліся. Яны вылезлі праз акно і зноў пачалі абстрэльваць дзверы і трапілі ў мяне куляй, яна выйшла навылёт.

Як удакладніла жанчына журналістам, пасля ранення маці і дачка ў стане шоку выбрацца з дому і паклікаць на дапамогу адважыліся толькі праз пэўны час.

— Яна паклікала суседзяў на дапамогу, а ў іх якраз салдаты прыйшлі, да нас яны не паспелі на некалькі хвілін. Гэтыя салдаты забралі мяне да сябе, у машыны гэтыя, браневікі, наклалі павязку, каб кроў не вылівалася. Павінны былі рабіць эвакуацыю, але не ў горад Кіеў, яны ж не робяць туды эвакуацыю, бо гэта ж не ўкраінскае войска ратавала нас. Таму даставілі мяне ў нейкае іншае месца, як дыслакацыю, не ведаю, як правільна. А да мяне пад вечар гэтыя ж салдаты прывезлі і дзіця маё. Мы паляцелі на верталёце спачатку ў шпіталь вайсковы, там аказалі дапамогу, паставілі жгут, таму што двое сутак нічога не рабілася, а станавілася толькі горш. А потым сюды адправілі, — расказала пацярпелая жанчына.

Жанчына ўдзячная ўсім, хто аказаў ёй дапамогу. Калектыву мазырскай бальніцы жыхарка Кіева шчыра ўдзячная за дапамогу і ўвагу, падтрымку і спагаду не толькі да яе як пацыенткі, але і да яе дачкі. Дзяўчынка знаходзіцца побач з маці ў палаце.

Яшчэ жанчына падзялілася, што вельмі хвалюецца за сваіх сваякоў, якія засталіся ва Украіне. Дзякуючы дапамозе медыкаў ёй удалося звязацца з роднымі ў Кіеве, якія з сярэдзіны мінулага тыдня нічога не ведалі аб лёсе сям'і.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота ТРК «Мазыр».

Дарэчы

Падарункі ад Прэзідэнта

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай Рагашчук павіншаваў з 8 Сакавіка і ўручыў салодкія падарункі ад Аляксандра Лукашэнкі ўкраінскім жанчынам і іх дзецям, якія знаходзяцца ў здраўніцы ў Гомельскім раёне.

У гомельскі санаторый украінскія сем'і прыбылі з-за падзей, якія адбываюцца ў іх краіне.

«Прэзідэнт Беларусі трымае сітуацыю на кантролі і прасіў перадаць словы падтрымкі. Беларусь усё зробіць для таго, каб усё было добра», — сказаў Мікалай Рагашчук.

«Усім вялікі дзякуй. Вялікі дзякуй Прэзідэнту», — падзякавала Алена Халюк. Маці чацвярых дзяцей расказала, што ў беларускай здраўніцы сям'я асвоілася добра, забяспечана ўсім неабходным. «Толькі хвалююся за мужа, які застаўся ў Кіеве», — дадала жанчына.

Яна падзялілася, што ў найбліжэйшы час плануе працаўладкавацца на адным з сельгаспрадпрыемстваў рэгіёна. «Там будзем асвойвацца. Будзе работа, жыллё. Дзяцей аформім у садок, у школу», — адзначыла Алена.

Падобныя планы на найбліжэйшую будучыню і ў Ірыны Губскай, якая прыбыла з Украіны ў Беларусь з двума дзецьмі. «Прынялі нас добра, усё ў нас ёсць. Дзякуй усім, хто нам дапамог у гэтай сітуацыі. Вельмі трывожна за дачку, якая засталася ва Украіне. Сувязь ёсць, але пакуль прыехаць сюды ў яе няма магчымасці», — прызналася жанчына.

Да віншаванняў далучылася і абласная арганізацыя Беларускага Чырвонага Крыжа, падрыхтаваўшы падарункі і для жанчын, і для дзяцей.

Мікалай Рагашчук звярнуў увагу, што з моманту прыбыцця ў Беларусь эмацыянальны стан украінскіх сем'яў змяніўся ў лепшы бок, дзеці задаволены, радуюцца шчыра падарункам.

Памочнік Прэзідэнта адзначыў, што ўкраінскім сем'ям аказваюць усебаковую дапамогу — адзенне, харчаванне, вырашаюцца пытанні выдзялення жылля, работы. «Важна, каб людзі адчувалі цеплыню, падтрымку», — сказаў ён.

ЛАМАЕЦЦА ТАМ, ДЗЕ ТОНКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А ўжо, між іншым, вясна пачалася, прынамсі, каляндарная. Шчыра кажучы, і зімы добрай не было — такой, каб з моцным марозам, са снежнымі сумётамі па калена. Адным словам, надвор'е ў гэтым сезоне мала калі спрыяла бяспечнай рыбалцы. Аднак ці шмат хто пра гэта думаў?!

Дапамога падаспела

21 лютага ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што пад лёд на рацэ Гайна ў Лагойску праваліўся чалавек.

— Да месца здарэння прыбылі два аддзяленні нашай часці, — расказаў **начальнік варты пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 Лагойскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр АЛЕШКА.** — На адлегласці 30 метраў ад берага ў вадзе знаходзіўся чалавек: на паверхні заставалася толькі галава мужчыны.

Супрацоўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, доўга не думаючы, узяў ратавальны круг і кінуў яго пацярпеламу. «Мужчына быў у прытомнасці, аднак самастойна выбрацца з палонкі не мог, — згадвае ратавальнік. — Я наблізіўся да яго яшчэ бліжэй і, схапіўшы за куртку, зацягнуў мужчыну на круг».

Тым часам яго калега, Максім Рамашка, падбег з лесвіцай. Ратавальнікі паспяхова выцягнулі грамадзяніна на бераг. Як потым высветлілася, мужчына, жыццё якога магло так раптоўна абарвацца, спрабаваў праз раку скараціць шлях. Пацярпелага перадалі медыкам. З папярэднім дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» ён быў шпіталізаваны.

Фота прэс-службы МНС.

Паспяхова скончылася ратавальная аперацыя і ў Добрушы. Дапамога супрацоўнікаў МНС спатрэбілася мужчыне і жанчыне, якія, займаючыся скандынаўскай хадой, вырашылі скараціць дарогу па тонкім лёдзе. Добра, што побач аказаліся неабыякавыя людзі, якія выклікалі ратавальнікаў.

На дно возера Спораўскае ў Бярозаўскім раёне маглі пайсці і два рыбакі. Калі супрацоўнікі МНС прыбылі на месца здарэння, пацярпелыя знаходзіліся ў вадзе на адлегласці 300 метраў ад берага.

— Апрануўшы касцюм сухога тыпу і прывязаўшы вяроўку да ратавальнай дошкі, я накіраваўся рыбакам на дапамогу, — расказвае **камандзір аддзялення пажарнага аварыйна-ратавальнага паста № 14 аграгарадка Спорава Аляксандр ВАКУЛЬЧЫК.** — Дабраўшыся да мужчын, адразу спытаў аб іх самаадчуванні. Першым на ратавальную дошку выцягнуў старэйшага мужчыну. Вырашыў кінуць ратавальную вяроўку другому пацярпеламу, які знаходзіўся на адлегласці каля 10 метраў ад першага, але той не змог схапіцца за яе, бо моцна замерзлі рукі. Лёд быў вельмі тонкі і друзлы. Я пачаў ламаць яго ў напрамку другога пацярпелага. Наблізіўшыся да яго, схапіў за вопратку і падвёў у зваротным напрамку да ратавальнай дошкі, дапамог на яе падняцца.

Іншыя супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дапамаглі рыбакам дабрацца да берага. Адзін з іх, пенсіянер, быў дастаўлены ва ўстанову аховы здароўя. Другому, маладзейшаму, медыцынская дапамога не спатрэбілася.

Каб не трапіць у палонку

Гэта добра, калі побач з тым, хто тоне, знаходзяцца людзі. На жаль, так бывае не заўсёды. Часта, ідучы на рыбалку, грамадзяне нават не паведамляюць аб сваіх планах, а тым больш аб месцазнаходжанні, родным ці знаёмым.

У першы дзень вясны ратавальнікам паступіла паведамленне аб мужчыне, які патануў у возеры ў Глыбоцкім раёне. Выцягвалі з вады патанулага і днямі раней у Пухавіцкім раёне. Амаль кожны дзень стужкі навін расказваюць аб новых ахвярах вады. У большасці выпадках прычына іх гібелі — выхад на тонкі лёд.

— Не рызыкуйце сваім жыццём, пагаварыце з дзецьмі аб сур'ёзнасці наступстваў гульняў на лёдзе і вадаёмах, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — У выпадку, калі вы сталі відавочцам здарэння, неадкладна паведаміце аб гэтым па тэлефоне «101» або «112». Ацаніце абстаноўку, калі ёсць магчымасць дапамагчы, працягніце таму, хто тоне, палку або вяроўку і выцягніце яго на бераг. Не кідайцеся на злом галавы да таго, хто праваліўся ў палонку, — вы таксама можаце апынуцца ў пастцы.

Каторы раз ратавальнікі папярэджваюць аб тым, наколькі небяспечна выходзіць на лёд. Аднак ці кожны прыслухоўваецца да гэтых рэкамендацый?! Вопытныя рыбакі павінны ведаць (а нявопытныя — назаўсёды запомніць!), што трываласць лёду лёгка вызначаецца па яго колеры. Самы моцны лёд мае празрысты сіні колер, слабы — непразрысты белы, найбольш далікатны — серы і серы «ў крапінку»: пры знаходжанні на такім пакрыцці шанц зладзіць сабе экстрэмальную лоўлю вельмі вялікі. Акрамя таго, трэба ведаць, што пры нулявой тэмпературы, якая захоўваецца на працягу трох дзён, трываласць лёду зніжаецца на 25 %. Забараняецца выходзіць на лёд у перыяды яго замярзання і раставання. Небяспечна правяраць трываласць лёду ўдарам нагі. Лепш за ўсё рыбачыць там, дзе ёсць станцыі Таварыства ратавання на водах — там заўсёды дзяжураць ратавальнікі.

Калі вы ўсё ж такі праваліліся пад лёд, варта прытрымлівацца наступных правілаў:

— не панікуйце;

— клічце на дапамогу;

— імкніцеся не паглыбляцца ў ваду з галавой;

— павярніцеся ў той бок, з якога прыйшлі;

— раскіньце рукі і напаўзайце на лёд грудзьмі;

— закіньце на лёд нагу і адкаціцеся ад палонкі;

— выбраўшыся з вады, не спяшайцеся ўставаць (каб не праваліцца зноў), паўзіце да берага па сваіх слядах.

Вераніка КАНЮТА.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Круглы стол

«НЕ ПРОСТА РАБОТА, А АДРЭЗАК ЧАСУ ДАЎЖЫНЁЙ У ЖЫЦЦЁ»

Жанчыны-медыкі — шчыра аб прафесіі, стылі кіравання і стасунках ва ўмовах пандэміі

Наўрад ці хто стане аспрэчваць, што прафесія медыка — адна з самых высакародных. Апошнія гады, калі ўрачы змагаліся з пандэміяй COVID-19, толькі дадалі ўпэўненасці ў гэтым. У Беларусі, як і ў многіх іншых краінах, большасць медыкаў — жанчыны. З нагоды галоўнага жаночага свята ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы прайшоў круглы стол «Жанчына-медык у сучасным свеце», дзе прадстаўніцы гэтай прафесіі шчыра расказалі пра сваю работу, пра тое, што нават на высокіх пасадах яны найперш застаюцца дактарамі: пры неабходнасці вядуць прыём у чырвонай зоне, прымаюць роды, становяцца да аперацыйнага стала. Як удаецца сумяшчаць такую няпростую працу з клопатам пра сям'ю і не забываць аб тым, што ты — жанчына, у нашым матэрыяле.

«Маці для сваіх падначаленых»

Алена ЛАТУШКІНА, намеснік старшыні Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя, пачала з экскурсу ў гісторыю:

— Першапачаткова прафесія медыка была мужчынскай, а жанчынам забаранялася займацца гэтай справай. На працягу XVIII—XIX стагоддзяў жанчыны адстойвалі свае правы, у тым ліку і права займацца лячэбнай дзейнасцю. Сёння яно паспяхова рэалізавана ва ўсіх нас, і вялікае жаданне займацца любімай справай дазваляе паспяваць усё: заставацца жанчынай, жонкай, маці і прафесіяналам.

Вольга ЕСЬМАНЧЫК, галоўны ўрач 1-й сталічнай клінічнай бальніцы, расказала пра работу не толькі жанчыны-медыка, але і жанчыны-кіраўніка:

— Разважаючы пра жанчыну-кіраўніка, мы мусім не забываць пра тое, што сама яна не можа вырашыць усе праблемы. Гэта заўсёды карпатлівая праца каманды, якая разам з табой кожны дзень. Мы сустракаемся кожную раніцу, абмяркоўваем нюансы — арганізацыйныя, лячэбныя. Вось так цэлы дзень наведваеш палаты, арганізоўваеш аказанне медыцынскай дапамогі, а ў канцы працоўнага дня, заходзячы ў радзалу, разумееш: толькі што на свет з'явілася новае жыццё — і дзень пражыты недарэмна. У імгненне ўвесь цяжар працоўных будняў сыходзіць, калі ты чуеш першы крык дзіцяці і разумееш, што ў яго 9-10 па шкале Апгар (хуткая сістэма ацэнкі здароўя нованароджанага, 9-10 — найвышэйшыя балы. — **«Зв.»**) і гэта вялікае шчасце. Вяртаешся ў кабінет і, ацэньваючы свой дзень, адчуваеш, што жыццё цудоўнае і з поўным задавальненнем можаш сысці дадому. А калі дома цябе чакаюць блізкія, то новы дзень сустракаеш з удзячнасцю за тое, што ў цябе ёсць.

У мяне ў калектыве, як, упэўнена, і ў астатніх прысутных, працуюць сапраўдныя прафесіяналы. Нягледзячы на тое што сёння ў прафесіі медыка пераважна жаночае аблічча, яны бяруць на сябе шмат будзённай працы, становяцца да аперацыйнага стала, працуюць у рэанімацыі, аказваюць дапамогу побач з ложкам пацыента і здзяйсняюць тыя цуды, якія дапамагаюць выратаваць жыццё.

У чым адрозненне стылю кіравання мужчыны і жанчыны, паразважала **Наталля САЕВІЧ, галоўны ўрач 3-й сталічнай клінічнай бальніцы імя Я. У. Клумава:**

— Апошнім часам мы ўсё часцей чуем такое словалучэнне, як жанчына-кіраўнік. І такі стыль кіравання сур'ёзна адрозніваецца ад мужчынскага. Бо ў жанчыны іншы падыход: гэта і жаданне зразумець чалавека, і вырашыць нейкія канфліктныя сітуацыі, імкненне дасягнуць сваёй мэты. Таму я думаю, што кожная жанчына прыносіць у свой калектыў часцінку дабрыні, справядлівасці — таго, чаго часам не хапае мужчынам, якія стараюцца прыняць рашэнне хутка. Мне здаецца, стыль жаночага кіравання ў нейкай ступені маглі б пераняць і мужчыны. У той жа час якім бы кіраўніком ні была жанчына, яна заўсёды мусіць заставацца жанчынай. Бо, як казала Маргарэт Тэтчэр, жанчына заўсёды паспяховая, калі яна застаецца жанчынай.

Ганна КОТАВА, галоўны ўрач 6-й сталічнай дзіцячай клінічнай паліклінікі, расказала, чаго патрабуе ад медыка работа з дзецьмі:

— Урач-педыятр — прафесія асаблівая. Наша задача — не толькі лячыць малых, але і суправаджаць здаровае дзіця. І менавіта ад урача залежыць і кантакт з бацькамі, і здароўе дзіцяці ў будучыні. Як бы цяжка часам на працы ні было, калі садзішся весці прыём, калі бачыш дзіця, кантактуеш з ім, напаўняешся неверагоднай энергіяй і далей гатова тварыць, развіваць, працаваць, каб і бацькам было камфортна ў сценах нашай паліклінікі і каб дзеці хутчэй папраўляліся.

Кожная жанчына-кіраўнік — маці для сваіх падначаленых, і вельмі важна стварыць адпаведную атмасферу. Мой дэвіз — стаўся да людзей так, як хацеў бы, каб яны ставіліся да цябе. Калегі ў калектыве — а там пераважная большасць жанчын — мяне выдатна разумеюць, такі дух у нас існуе, і нам вельмі камфортна.

«Было няпроста, але мы справіліся»

Ірына БОРЫС, намеснік галоўнага ўрача па акушэрска-гінекалагічнай дапамозе 6-й сталічнай клінічнай бальніцы Мінска, распавяла, як аказвалі дапамогу маладым матулям з COVID-19:

— Я працую кіраўніком аднаго з найбуйнейшых раддомаў сталіцы — там, дзе ў гэты свет прыходзяць новыя жыцці, а мы іх сустракаем. Безумоўна, наша праца вельмі важная, значная. Апошнія два гады мы функцыянавалі ў не зусім звыклых умовах. Пандэмія COVID-19 прыйшла да ўсіх, і мы сталі тым раддомам Мінска, які прымаў цяжарных жанчын з інфекцыяй — спалоханых, разгубленых. Мы аказвалі дапамогу, прымалі роды, дапамагалі ў пасляродавым перыядзе. І я ўдзячная кожнаму супрацоўніку, які працуе ў раддоме, усёй маёй камандзе. Мы былі адзіным арганізмам, і гэта дапамагло нам навучыцца аказваць дапамогу, выпрацаваць свае алгарытмы, даваць людзям надзею на выздараўленне і несці сваю місію прыгожа, годна, а гэта, паверце, было зусім няпроста.

Сучасны свет накладвае свой адбітак на жанчыну-кіраўніка, і мы мяняемся. Але такія агульначалавечыя якасці жанчыны, як дабрыня, разуменне, цярпенне, дадзены жанчыне ад нараджэння і яна нясе іх у любыя часы. Калі жанчына можа даваць надзею, бачыць у чалавеку талент і накіроўвае яго, умее стварыць каманду, тады і калектыў будзе працаваць якасна, правільна прымаць рашэнні, своечасова бачыць праблему і вырашаць яе.

Наш раддом дастаткова вядомы. Мы першыя ў краіне пачалі прымаць vip-роды, у нас ёсць палаты сямейнага тыпу, да нас прыязджаюць людзі з іншых краін. З 1 сакавіка мы працуем у змешаным рэжыме: да нас прыходзяць як інфіцыраваныя, так і здаровыя цяжарныя. Мы вядзём партнёрскія роды, гэта таксама важна ў акушэрстве. Тата ў такі момант патрэбны і малому, і маці, ён падтрымлівае жонку, напаўняе яе ўпэўненасцю.

Тэму працы падчас пандэміі закранула і **Алена КАСЦЮКОВА, загадчыца аддзела інфармацыйнай, міжнароднай работы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя:**

— Прафсаюз падчас пандэміі са свайго боку пастараўся даць адчуць медыкам, што яны не адны, працягнуць руку дапамогі. Падтрымка аказвалася медыцынскім установам і канкрэтна кожнаму медыку, які звярнуўся, на ўзроўні пярвічак, абкамаў, рэспубліканскага камітэта. Гэта і матэрыяльная дапамога на звароце ў прафсаюз з прычыны перанесенага захворвання, а таксама рэабілітацыя і аздараўленне медработнікаў у санаторыях. Сродкі накіроўваліся і на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы медустаноў, закупку сродкаў індывідуальнай аховы, экіпіроўку экіпажаў хуткай дапамогі, набывалася кіслародныя канцэнтратары, рэцыркулятары паветра, мэбля, абсталяванне для пакояў прыёму ежы, бо, як вядома, падчас першых хваляў медработнікі ўвогуле не маглі трапіць дадому. Больш за 6 мільёнаў рублёў пайшло на падтрымку сістэмы аховы здароўя. Мы памятаем, як неўролагі перакваліфікаваліся ў пульманолагаў, галоўныя ўрачы заступалі на пост галоўнай медыцынскай сястры і ўсе працавалі на адну вялікую справу — выратаванне жыццяў.

«Мы сталі больш з'яднанымі»

Аксана ЖУКОЎСКАЯ, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, таксама паразважала пра ролю жанчын-медыкаў падчас пандэміі:

— Я ўрач агульнай практыкі, загадчыца амбулаторна-тэрапеўтычнага аддзялення, і работа з пацыентамі з каранавіруснай інфекцыяй — непасрэдны занятак мой і маіх падначаленых. Для нас гэта работа пачалася 26 сакавіка 2020 года, калі ў зоне нашага абслугоўвання быў зафіксаваны першы пацыент з COVID-19. За гэтыя два гады прайшло некалькі хваль, мы перасталі дэманізаваць гэты вірус, цяпер усё нашмат спакайней. Аднак работа не перапынялася і не перапыняецца сёння. І ляжыць яна пераважна на жаночых плячах: з 870 чалавек, якія ў нашым цэнтры працуюць, толькі 120 мужчын. Дзякуючы зладжанай работе ўдавалася спраўляцца ў самыя цяжкія моманты.

Марыя ЖУРОВІЧ, загадчыца пульманалагічнага аддзялення № 2 6-й сталічнай клінічнай бальніцы:

— У медыцыне я 40 гадоў. Для мяне гэта не проста прафесія, а адрэзак часу даўжынёй у жыццё. Пандэмія каранавірусная інфекцыі для нашага аддзялення пачалася 28 лютага 2020 года. Работа падзялілася — да коўіду і пасля. Гэтыя два гады страсянулі ўвесь свет. Было шмат сумных момантаў: няўпэўненасці, якая прыводзіла да адчаю, бо ў гэтым захворванні шмат нетыповага. Толькі дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, а гэта і матэрыяльная дапамога медыкам, і аснашчэнне абсталяваннем і медыкаментамі, людзі пачалі папраўляцца, значна зменшылася смяротнасць. Работа на перадавой — пра ўвесь наш калектыў. Без перабольшвання гэта мая сям'я, і за апошнія два гады мы сталі больш дружнымі, з'яднанымі, гатовымі прыйсці на выручку.

Гэта важна

У КРАІНЕ ДАСТАТКОВА ЛЕКАЎ І МЕДВЫРАБАЎ НА СКЛАДАХ

У цяперашні час сфарміраваны дастатковы запас лекавых прэпаратаў. Уведзеныя ЗША і краінамі ЕС абмежаванні для Расіі не датычацца фармацэўтычнай галіны і не паўплываюць на пастаўкі лекаў у Беларусь, паведамляе Міністэрства аховы здароўя. Асаблівая ўвага ў нашай краіне ўдзяляецца медыкаментам, якія з'яўляюцца жыццёва неабходнымі.

Міністэрства аховы здароўя прааналізавала лекавыя прэпараты, якія знаходзяцца на складах, па пераліку асноўных лекавых сродкаў, і паведамляе, што існуючых астаткаў дастаткова для бесперапыннага лекавага забеспячэння насельніцтва на працягу 6—17 месяцаў.

Што да фізрастворaў, ваты, бінтоў, іншага неабходнага матэрыялу, то гэтыя групы вырабляюцца беларускімі прадпрыемствамі.

Некаторыя пазіцыі будуць заменены іншай фасоўкай (напрыклад, прапафол 20 мл і 50 мл), іншым вытворцам. З пункту гледжання вытворчасці можна адзначыць, што асноўным пастаўшчыком субстанцый у Беларусь з'яўляецца Кітай (больш за 70 працэнтаў найменняў), другім — Індыя.

Таксама адзначым, што цяпер Міністэрствам аховы здароўя атрымана інфармацыя ад замежных фармацэўтычных кампаній, што яны не плануюць спыняць пастаўкі лекавых прэпаратаў у нашу краіну. Усе вытворцы пацвердзілі адгрузкі. Вядома, змянілася лагістыка дастаўкі, але лекавыя прэпараты не знікнуць з аптэчнай сеткі.

Акрамя таго, на наступным тыдні пройдуць запланаваныя раней перагаворы з вядучымі замежнымі фармкампаніямі аб лакалізацыі вытворчасці некаторых найважнейшых лекавых сродкаў у Беларусі.

«Я Ў ПАРЛАМЕНЦЕ, КАБ АДСТОЙВАЦЬ ІНТАРЭСЫ МОЛАДЗІ»

Ігар ЗАВАЛЕЙ — прадстаўнік новага пакалення беларускіх дэпутатаў. Спартсмен, «камсамолец», адказны бацька, ён захапляе суразмоўцаў сваім аптымізмам. У інтэрв'ю для новага выпуску рубрыкі «Плеяда маладых» паразмаўлялі з парламентарыем на многія тэмы: чаму футбол лепшы энергетык, чым кава, як настроіць арганізм на 100-працэнтную працаздольнасць і перайсці на вегетарыянства, закранулі праблему выхавання дзяцей і важнасць спартыўнага характару для парламенцкай работы.

— Ігар Уладзіміравіч, вы пачыналі прафесійны шлях са спорту. Раскажыце, якім відам займаліся і чаму абралі палітыку замест кар'еры спартсмена?

— Я з дзяцінства займаўся лёгкай атлетыкай. У дзявятым класе перайшоў у вучылішча алімпійскага рэзерву. Выканаў разрад кандыдата ў майстры спорту па лёгкай атлетыцы на дыстанцыі 400 метраў з бар'ерамі. Калі паўстала пытанне, куды ісці вучыцца, вырашыў працягваць сваю справу — паступіў на факультэт фізічнай культуры. Але спартыўная кар'ера не склалася — на трэцім курсе здарылася траўма. Пасля вучобы працаваў інструктарам-метадыстам у дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе, потым — у школе вышэйшага спартыўнага майстэрства. Там, дарэчы, я працаваў з атлетамі, што ўдзельнічалі ў Алімпійскіх гульнях. Праз паўтара года мяне запрасілі на працу ва ўпраўленне спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама. Там я працаваў тры гады, пакуль лёс не прывёў на пасаду першага сакратара Гомельскага абласнога камітэта БРСМ. Саюзу моладзі я аддаў пяць гадоў. Гэта была добрая школа, дзякуючы якой я прыйшоў у палітыку.

— Якое месца спорт цяпер займае ў вашым жыцці?

— Трэніруюся для сябе. Як былы спартсмен разумею, што без фізічнай нагрузкі складана чакаць стапрацэнтнай працаздольнасці арганізма. Праз спорт мы атрымліваем дадатковую энергію.

— У вас ёсць нейкі спартыўны расклад тыдня?

— Так, у панядзелак і суботу ў мяне вечарам футбол. Як правіла, у аўторак і чацвер — трэнажорная зала. З узростам фізічную актыўнасць трэба павялічваць, каб арганізм захоўваў працаздольнасць. На наступны дзень пасля трэніроўкі адчуваеш сябе выдатна. Калі па нейкіх прычынах выпадаеш са спартыўнага рытму, праз пару тыдняў пачынаецца санлівасць, абыякавасць, нічога не хочацца рабіць. Не ўсе гэта разумеюць і спрабуюць вырашыць праблему кавай, энергетыкамі. Але адказ на паверхні: трэба весці здаровы, фізічна актыўны лад жыцця. Гэта навука!

— Але здаровы лад жыцця — яшчэ і харчаванне.

— Гэта самае галоўнае ў працаздольнасці арганізма. Многія мае сябры адмаўляюцца ад мяса, замяняючы бялок арэхамі, бабовымі. Кажуць, што адчуваюць сябе па-іншаму. Я спрабаваў месяц не есці мяса і на самай справе заўважыў змены да лепшага. Усё часцей падумваю адмовіцца ад мяса цалкам, але пакуль не рашыўся.

— Раскажыце падрабязней пра захапленне футболам. У якой камандзе гуляеце?

— Гуляю за зборную парламента на аматарскіх турнірах і ў футбольным клубе «Дыпламат». У яго ўваходзяць пасольскія работнікі краін і СНД, і Еўрасаюза. У палітычным плане з Захадам шмат рознагалоссяў, але футбол нас яднае. На адным полі, нават у адной камандзе да нядаўняга часу, гулялі і беларусы, і немцы, і англічане, і рускія, і ўкраінцы.

Дэвіз па жыцці: «Толькі разам і толькі наперад».

— Адчуваецца, што спорт — ваша стыхія. Сёння і ў парламенце курыруеце гэту сферу. Як увогуле прыйшлі да рашэння выбірацца дэпутатам?

— Я працаваў у БРСМ. Гэта вельмі цікавая дзейнасць — маладзёжная, жывая, але з часам я страціў запал, і ККД пачаў падаць. Здаецца ж, японцы кажуць: кожныя чатыры гады трэба кардынальна мяняць месца работы. Я згодны.

Паглядзеў, што выбары ў парламент будуць праз год і падумаў, што я ўжо чатыры гады сустракаюся з моладдзю вобласці, стаў пазнавальнай асобай у сваім рэгіёне, вырашыў паспрабаваць балатавацца па Гомельскай сельскай 37-й акрузе. Мае знаёмыя дапамаглі сабрать подпісы. Плюс я папрасіў мяне падтрымаць Добрушскі фарфоравы завод, каб вылучыцца і ад працоўнага калектыву. За выбарчую кампанію я наведаў усе сельсаветы свайго ўчастка, зайшоў у кожны сельмаг, прадставіўся, паразмаўляў з вяскоўцамі. Я адзіны з кандыдатаў прымяніў таргет-рэкламу ў сацсетках са сваім тварам і прозвішчам для павышэння пазнавальнасці. Заканадаўствам гэта, дарэчы, не рэгулюецца. Зараз я рыхтую прапановы ў Выбарчы кодэкс, каб унармаваць ролю сацсетак у выбарчай кампаніі.

— Памятаеце сваіх канкурэнтаў?

— Два маладыя мясцовыя хлопцы. Яны падумалі, што паходжанне — іх козыр, бо я не ўраджэнец ні Добрушскага, ні Гомельскага раёна. Відавочна, спадзяваліся на гэта, але іх кампанія не была настолькі інтэнсіўнай. А мая праца дала вынік — набраў 66 %.

«На гэтай працы кожны дзень не падобны на ўчарашні».

— Чым займаецеся на пасадзе парламентарыя? У распрацоўцы якіх законаў бралі ўдзел?

— Зараз у парламенце на разглядзе закон аб фізічнай культуры. Ён прайшоў першае чытанне. Я ўваходзіў у рабочую групу Міністэрства спорту і турызму над законапраектам, каб мае заўвагі і прапановы рэалізавалі пры падрыхтоўцы. Спартыўная грамадскасць папрасіла ўнесці змяненні, што датычыцца вучылішчаў алімпійскага рэзерву. Спартыўныя школы забіраюць да сябе дзяцей на ўмовах пансіяната. Але часам юных спартсменаў бяруць на прагляд на месяц: ці здолеюць яны працавать у гэтым рытме. Юрыдычна статус такіх «навабранцаў» быў нявызначаны. Пад сваю адказнасць юніёра адпускаў дырэктар агульнаадукацыйнай школы, і пад сваю адказнасць браў дырэктар вучылішча. Любая праверка магла выкрыць правапарушэнне, таму неабходна было ўрэгуляваць такія выпадкі. Мяне пачула міністэрства. Адмысловыя папраўкі былі ўнесеныя і ў Кодэкс аб адукацыі, які быў у той час на разглядзе ў парламенце. То-бок атрымалася скарэкціраваць два законы.

— Вы як намеснік кіраўніка рабочай групы па супрацоўніцтве з парламентам Італіі кантактуеце з італьянскімі бізнесменамі. Чым замежнікам цікавая наша краіна?

— Вельмі часта да мяне звяртаюцца за дапамогай італьянскія прадпрымальнікі, каб пераехаць і перавезці да нас свой бізнес. Яны скардзяцца на высокія падаткі, бюракратыю ў сваёй краіне. Напрыклад, у мяне была сустрэча з бізнесменамі, якія хочуць адкрыць у нас школу барбершопераў і для гэтага пераехаць сюды. Ім неабходна была юрыдычная дапамога, тлумачэнне, як пачаць сваю дзейнасць. Італьянцы вельмі любяць Беларусь. На афіцыйным узроўні ёсць праблемы, але звычайныя людзі вельмі паважаюць беларусаў.

— Спартыўны характар дапамагае ў дэпутацкай рабоце?

— Гэта аснова. Калі няма характару, будзе складана працаваць з міністэрствамі, з калегамі — не зможаш адстаяць сваю пазіцыю. Уявіце: у Палаце прадстаўнікоў 110 чалавек, і большасць — «мастадонты». Яны і дырэктарамі, і кіраўнікамі раёнаў, і старшынямі аблвыканкамаў, і генераламі былі!.. У іх велізарны бэкграўнд. Калі ў парламент прыйсці без стрыжня, тут страціш сябе, будзеш бескарыснай адзінкай. Я ў парламенце, каб адстойваць інтарэсы моладзі. І нават розніца з калегамі ў 20 гадоў адбіваецца на тым, што мы думаем па-рознаму. Без характару не зможаш адстаяць тое, чаго хочаш для моладзі.

— Вы нарадзіліся ў Сургуце, гэта Цюменская вобласць. Як апынуліся ў Беларусі?

— Мае бацькі жылі ў Гомелі, але ў іх маладосці было модна з'язджаць на Поўнач, будаваць нафтавыя заводы. Там добра плацілі, давалі адразу жыллё. Усё было добра, акрамя надвор'я. Калі разваліўся Савецкі Саюз, усё змянілася. Стала цяжка нават з набыццём прадуктаў. З-за праблем лагістыкі харчаванне проста не даязджала. З дзяцінства засталіся такія ўспаміны... Мама адпраўляе ў магазін. Там стаіць прадавец за прылаўкам з велізарным бітонам малака, а на паліцах — толькі хлеб. Ты можаш купіць буханку і малака. Сургут — поўнач, і там няма ніякага аграрнага сектара. Выратоўвала тайга, бо бацька быў паляўнічым. Дапамагалі бабуля і дзядуля, якія дасылалі пасылкі з кансервамі, згушчонкай, тушонкай. Мы трывалі, але потым вырашылі з'язджаць. Цяпер там усё добра, і Сургут — адзін з самых багатых гарадоў Расіі. Але я ні аб чым не шкадую.

— З Расіі вы вярнуліся ў Гомель?

— Так, тады мне было толькі дзевяць гадоў. Усё сваё свядомае жыццё я пражыў у Беларусі. Мяне выхавала, усё дала Беларусь. Дзякуючы ёй я многа цяпер маю. Але ў пашпарце маё месца нараджэння — Цюменская вобласць. Я ўвогуле па нацыянальнасці ўкраінец (мае бацькі родам адтуль), нарадзіўся ў Расіі, жыву ў Беларусі. І калі цяпер расказваюць, хто нашы, хто не нашы, для мяне гэта смешна. Я не разумею людзей, якія кажуць, што мы рознyя.

— Вы бацька дваіх сыноў. Колькі ім гадоў?

— Восем і чатыры.

— Як вам удаецца знайсці баланс паміж грамадскай дзейнасцю і выхаваннем дзяцей?

— Няма нічога немагчымага, калі ўмееш планаваць дзень. Стараюся ўдзяляць ім увагу. Старэйшага сына бяру на трэніроўкі. Ён са мной у камандзе не гуляе, але з дзецьмі іншых футбалістаў штурхае мячык убаку. З малодшым сынам больш часу праводзіць жонка. Я лічу, што пэўны час хлопчыку павінна больш увагі ўдзяляць маці. А ўжо з сямі гадоў — бацька, каб сын мог капіраваць паводзіны. Я імкнуся быць ім прыкладам ва ўсім: быце, паводзінах, размовах, адносінах з жанчынай. Усе выхадныя я з сям'ёй. Сям'я важнейшая за работу.

— Як думаеце, ваш старэйшы сын ганарыцца вашым статусам, пасадай?

— Ён не ведае, чым я займаюся. Не расказваем, каб пазбегнуць таго, што ён будзе выхваляцца. Калі пытаецца, я кажу: «Сяджу ў кабінеце, паперы пішу». Калі будзе разумець больш, тады раскажу.

— Вы заўважылі, што кожныя чатыры гады работу неабходна мяняць. Дэпутацкі тэрмін праз пару гадоў скончыцца. Будзеце балатавацца зноў?

— Чым добрая работа парламентарыя: ты можаш год займацца пытаннямі спорту і пазнаёміцца больш глыбока са спецыялістамі гэтай сферы, а на наступны год — удзяліць увагу ахове здароўя: гэта іншыя людзі, іншыя праблемы, іншая спецыфіка. Не змяняецца толькі кабінет. Чым яшчэ ўнікальная праца дэпутата — мы падналеныя толькі народу, бачым яго праблемы і імкнёмся іх вырашаць. На гэтай працы кожны дзень не падобны на ўчарашні. Я прапрацаваў толькі два гады і яшчэ ў сярэдзіне шляху. Пакуль атрымліваю ад працы асалоду, асабліва калі нешта атрымліваецца зрабіць для грамадства. Яшчэ два гады наперадзе. Праз пэўны час я сяду і буду думаць: што далей?

Марыя ДАДАЛКА.

Извещение о проведении 21 марта 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4)
Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211
Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1
Начальная цена: 1 193 630,40 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 119 363,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **21 марта 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 09.03.2022 по 17.03.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Извещение о проведении 31 марта 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение (подземное битумохранилище) с инв. № 631/С-59042, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года, б/н составленному по состоянию на 25.05.2009 года; капитальное строение (водопроводная сеть) с инв. № 631/С-58995, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: водопроводная сеть протяженностью 175,6 м., состоящая из напорного трубопровода, колодца, артезианской скважины, водонапорной башни; капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 631/С-12108 общей площадью 308,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса, с пристройкой, асфальтно-бетонной площадкой, тремя ограждениями (с воротами и столбами); капитальное строение (гудронохранилище) с инв. № 631/С-59045, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: гудронохранилище объемом 2061 м куб.; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59044, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 948 м куб.; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59043, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 648 м куб.; капитальное строение (здание весовой, проходной) с инв. № 631/С-12106 общей площадью 81,0 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой, проходной; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58979 общей площадью 110,1 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание склада с пристройкой; капитальное строение (котельная) с инв. № 631/С-12107 общей площадью 102,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной с пристройкой; капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 631/С-58986 общей площадью 57,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58980 общей площадью 65,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное здание склада; капитальное строение (компрессорная) с инв. № 631/С-58981 общей площадью 81,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание компрессорной с пристройкой, тремя емкостями; капитальное строение (электроцех) с инв. № 631/С-58982 общей площадью 39,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание электроцеха; капитальное строение (паропровод) с инв. № 631/С-58987, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной паропровод, протяженностью 184,8 кв. м, состоящий из двух участков; капитальное строение (битумопровод) с инв. № 631/С-58989, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной, битумопровод диаметром 75 мм, протяженностью – 201 м; капитальное строение (мазутопровод) с инв. № 631/С-58988, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б\н, составленному по состоянию на 16.06.2009 года; капитальное строение (канализационная сеть) с инв. № 631/С-58990, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная канализационная сеть протяженностью 108 м, состоит из двух участков и четырех колодцев; капитальное строение (линия электропередачи) с инв. № 631/С-58992, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная линия электропередачи протяженностью 646,6 м, напряжением 04 кВ, состоящая из четырех участков; капитальное строение (линия наружного освещения) с инв. № 631/С-58993, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: линия наружного освещения протяженностью 19,7 кв. м, напряжением 0,4 кВ, способ прокладки – подземный, состоит из двух участков и двух мачт; капитальное строение (сеть газопровода) с инв. № 631/С-65180 общей площадью 259,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 23.02.2018 года б/н, составленному по состоянию на 22.02.2018 г. Молодечненским филиалом РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; узел учета газа, инвентарный номер 1372; установка докотловой обработки воды, инвентарный номер 940; резервуар Р 2500000, инвентарный номер 402; резервуар Р-25, инвентарный номер 410; емкость металлическая, инвентарный номер 201; трансформатор ТМ 630/10, инвентарный номер 678; емкости, инвентарный номер 657; емкости, инвентарный номер 658; комплект системы управления «Альфа-П» инвентарный номер 670; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 671; котлоагрегат, инвентарный номер 693; котел Е 1/9, инвентарный номер 695; котел чугунный водогрейный, инвентарный номер 712; модуль подогрева топлива БСТ-МПТ-12-2, инвентарный номер 715
Сведения о земельных участках: площадь – 1,5355 га, кадастровый номер – 621350100001000310; площадь – 4,6829 га, кадастровый номер – 621350100004000541
Местонахождение: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Волкова, 43
Начальная цена: 143 494,15 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 14 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 31 марта 2022 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 10.03.2022 по 29.03.2022 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Извещение о проведении 31 марта 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 м куб. 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230
Местонахождение: Минская область, Минский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33
Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 31 марта 2022 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 10.03.2022 по 29.03.2022 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Информация о проведении **25 марта 2022 года в 11.00** аукциона **№ 328** по продаже права заключения **договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машиномест, их частей, находящихся в государственной собственности

Организатор аукциона: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360-42-22

Срок и место приема заявлений: с 4 марта 2022 г. по 21 марта 2022 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»), Минского областного исполнительного комитета – www.minsk-region.gov.by (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»).

Дополнительно информация о проведении аукциона будет размещена в газете «Минский курьер» 11.03.2022

УНП 190398583

Бацькаўшчына

У пошуках страчанага

МАЛАДЗЕЧАНСКІ МЕРЫДЫЯН

Калі весці гаворку пра Маладзечаншчыну, Маладзечна на старых паштоўках, то ў калекцыі знанага збіральніка гістарычнай памяці лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава прысутнічае нямала выяў з вобразамі гэтай старонкі.

Многія паштоўкі па часе нараджэння — ілюстрацыі ліхіх гадзін Першай Сусветнай... Даўно мне на вочы патрапілася кніга «Успаміны» расійскага кнігавыдаўца Міхаіла Васільевіча Сабашнікава. Гартаю яе старонкі. Падыходжу да раздзела «У час вайны»: «...Сярод з'яў нашага грамадскага жыцця, выкліканых вайною, асабліва вылучаліся ўзнікшыя тады самачынна арганізацыі дапамогі арміі — Земскі саюз, Гарадскі саюз, Земгор (аб'яднанне двух саюзаў), Ваенна-прамысловыя камітэты. Я прыняў удзел у рабоце «Саюза гарадоў». Летам 1915 года я адправіўся на чале Сібірскага медыка-санітарнага атрада (Бурацкага — як называўся ён таму, што абсталяваны быў часткова на сродкі бурат) на фронт, у размяшчэнне 10-й арміі. Атрад там працаваў у раёне Шастакова, разгарнуўшы ў будынках гэтай эвакуіраванай чыгуначнай станцыі свой лазарэт». І далей: «Затым мы былі перасунуты на шлях Вількамір — Вільня. З падзеннем Коўна армія адступіла, і Вількамір быў пакінуты, і наш лазарэт развярнуўся ў Вільні, а з адступленнем з Вільні размясціўся ў Маладзечна».

Разам з Міхаілам Васільевічам у атрадзе служыў і яго сын — Сяргей. Два словы — да яго біяграфіі. Нарадзіўся ў 1898 годзе. Памёр у 1952 годзе. Актыўна дапамагаў бацьку ў выдавецкіх справах. З сярэдзіны 1930-х гадоў — тэхнічны кіраўнік выдавецтва «Сотрудник».

Маладзечна. Вакзал (пач. XX ст.).

На некаторы час Сабашнікаў пакінуў фронт. А ўжо «ў лістападзе 1915 года, — успамінае кнігавыдавец, — я вярнуўся ў атрад. Я знайшоў яго ў Маладзечна. Ён даволі зручна размясціўся каля чыгуначнай станцыі, у двухпавярховым корпусе, побач з броварным заводам. Суседства гэта было крыніцай пастаянных хваляванняў і трывог...»

Давайце ж і мы, углядаючыся ў старыя паштоўкі, узгадаўшы ўражанні Міхаіла Сабашнікава, зазірнём у горад канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Нашым памагатым у гэтым падарожжы мог бы стаць і светлай памяці Генадзь Аляксандравіч Каханоўскі. Доктар гістарычных навук, сапраўдны краязнаўца зямлі беларускай, ён нараджэннем з вёскі Дамашы, многія дзесяцігоддзі пражыў у Маладзечна. Працаваў у абласным краязнаўчым музеі. Збіраючы экспанаты,

Маладзечна. 1930-я гады.

Міхаіл Васільевіч, ад прыроды чуйны да мастацкіх вобразаў, уважлівы да дэталяў, вельмі пільна ўглядаўся ў літоўска-беларускае памежжа: «Я ехаў па шырокай раўніне, якая на гарызонце акаймлялася лесам. Сонца ўжо пераваліла далёка за поўдзень, калі я ўбачыў наперадзе характэрныя літоўскія могілкі, на ўзгорку, абнесеныя агароджай з валуноў, зарослыя старымі высокімі соснамі, сярод якіх, спабрнічаючы з імі ў росце, высіліся надмагільныя крыжы, знаёмыя нам па карцінах Чурлёніса. Направа ад могілак віднелася панская сядзіба, а ўдалечыні на гарызонце маячыла ўскраіна чарналесся, масіў якога мне трэба было перасекчы...» І яшчэ: «...зазірнуў за агароджу могілак і ўбачыў на некалькіх помніках свежыя вянкі, букеты жывых кветак, пэўна, нядаўна пакладзеныя на магілы. Асаблівае замілаванне выклікалі маленькія букецікі, якія былі сабраны і пакладзены на магілы, несумненна, дзіцячымі рукамі. Колькі трэба мець самавалодання, каб пры паспешлівых уцёках наведаць дарагія магілы!»

матэрыялы для яго, абышоў усе ваколіцы. Ды і шмат паездзіў па архівах і бібліятэках па-за межамі Беларусі. Напісаўшы гісторыка-публіцыстычныя нарысы пра Маладзечна, Вілейку, пра людзей, яркіх асоб, звязаных з гэтай старонкай, ён шукаў сляды знакамітых беларусаў у Расіі, Літве... Нельга не сказаць, што шмат каму з людзей неруанадушных менавіта Генадзь Аляксандравіч даў пуцёўку ў краязнаўства. І зусім невыпадковым падаецца той факт, што ў 1989 годзе якраз Генадзь Каханоўскі стаў ініцыятарам і першым старшынёю Беларускага краязнаўчага таварыства...

Сёння аблічча горада ў многім фарміруецца дзякуючы чыгуначнаму вакзалу. Але так было не заўсёды. Лібава-Роменская чыгунка прыйшла ў Маладзечна ў 1873 годзе. Тады і пачалося хуткаснае прамысловае развіццё паселішча. Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што і раней у Маладзечна меўся патэнцыял для эканамічных здзяйсненняў. Тут хапала і рамеснікаў, і гандаль ішоў як след.

А калі б мы прайшліся старымі вуліцамі — па Мінскай, Віленскай, Замкавай (яна яшчэ называлася і Вілейскай), Гарадокскай, то абавязкова сустрэліся б з купкамі маладых людзей, якія не саромеліся ўслых чытаць вершы, умелі пажартаваць, ды і сур'ёзную філасофскую спрэчку здольнымі былі распачаць... Асабліва часта такое назіралася на Замкавай, дзе літарай «П» месціўся двухпавярховы будынак Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі... Генадзь Каханоўскі ў адной са сваіх кніг падкрэсліваў, што ўвесь комплекс будынкаў семінарыі аддзяляўся ад ваколіц каменнай сцяной. Складвалася ўражанне, што навучальная ўстанова ўяўляе сабой абарончую крэпасць. Хто тут толькі не вучыўся?!. Адзін з пачынальнікаў беларускай савецкай літаратуры Міхась Чарот, аўтар паэм «Босыя на вогнішчы», «Ленін», «Марына», «Чырвана-крылы вяшчун» і многіх іншых твораў... Спявак Міхась Забэйда-Суміцкі, які выступаў на сцэне «Ла Скалы», іншых тэатральных пляцоўках (выступаў з партыямі на 16 мовах!). Грамадскі дзеяч, празаік, журналіст Андрэй Капуцкі (некаторы час напрыканцы 1920-х працаваў у газеце «Звязда»). Заходнебеларускі рэвалюцыянер, член Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі Пятро Мятла... Дарэчы, аўтарам перабудовы семінарыі з паўразбуранага манастыра быў інжынер-архітэктар Іван Іванавіч Лявіцкі (1830 — пасля 1894)... З 1972 па 1884 гг. ён займаў пасаду віленскага губернскага інжынера, адначасова быў архітэктарам Віленскай навучальнай акругі. Іван Іванавіч — і аўтар перабудовы настаўніцкіх семінарый у Свіслачы, Полацку, Панявежы, мужчынскай гімназіі ў Віцебску...

Сёння ў Маладзечне не так і шмат слядоў даўніны. Некаторыя архітэктурныя помнікі зніклі ў прасторы мінулых часін. Ды вуліцы горада (афіцыйна Маладзечна стала горадам у 1929 годзе), несумненна, помняць не толькі семінарыстаў, але і многіх ураджэнцаў паселішча. Знакамітасцяў тут заўсёды хапала!.. Мастак, графік Меер Аксельрод, высокі савецкі дзяржаўны дзеяч Кандрат Церах (у 1963 — 1965 гг. — дырэктар Маладзечанскага гархарчпрамгандлю; а ў 1986 — 1991 гг. — міністр гандлю СССР), спявак і кампазітар Юрый Антонаў... Маладзечна — і



Праваслаўная царква (пач. XX ст.)

зараз горад талентаў, крыніца, якая шчодра выводзіць у вялікі свет яркіх асоб. Пэўна, прычынай гэтага і асаблівая сакральнасць старажытнага паселішча?..

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Маладзечна. Замкавая вул. 1930-я гады.

ЦЁПЛЫЯ СЛОВЫ — ЯК ПЯШЧОТНЫЯ АБДЫМКІ



Па гарызанталі: 2. Ударны музычны інструмент. **5.** Абдымкі і пацалункі — найлепшыя ... (прык.). **7.** Перакрыцце праёма ў сцяне. **9.** «... — як марожанае: салодкае, але хутка канчаецца». Цытата невядомага аўтара. **10.** «Дзяўчатам трэба абяцаць увесь.... І купляць марожанае». А. Давідовіч. **11.** Партыя для аднаго голасу. **12.** «... — гэта ўспомніць, што ў халадзільніку ёсць эскімо». Цытата невядомага аўтара. **13.** Зварот да замужняй жанчыны ў некаторых краінах. **14.** Вялікі майстар сваёй справы (перан.). **15.** Для мядзведзя зіма — адна ... (прык.). **17.** Прыгажосць да вянца, а ... да канца (прык.). **20.** Род жаночай прычоскі. **21.** Добрым людзям — мір, а шалёнцам — галавою ў ... (прык.). **22.** 16-я літара грэчаскага алфавіта. **23.** «У кожнага ёсць нешта ад птушак і жывёлін. У мяне — ..., а ў мужа — рогі». Цытата невядомага аўтара. **25.** «Упасці ў абдымкі мужчыны — лепшы ... адчапіцца ад яго». Л. Вальдарэн. **27.** «Абдымкі павінны быць такімі, каб іх адчувала не цела, а ... і сэрца». С. Нагорны. **28.** Змяя; ... таксама гатовы задушыць у абдымках кожнага (прык.). **29.** «Родная...» Цікавы, багата ілюстраваны часопіс. **30.** Тыгр і ... на адным беразе п'юць ваду (прык.). **31.** ... без мандарынаў усё роўна, што лета без марожанага (прык.). **32.** Прыправа да ежы.

Па вертыкалі: 1. Самы лепшы ... — абдымкі (прык.). **3.** Шырокая канапа. **4.** Раніца. **5.** ... горы разбівае (прык.). **6.** Інтымныя адносіны (разм.). **8.** Беларускі народны танец. **13.** «... трашчыць, // Вада коціцца. // Аж сэрца баліць — // Гуляць хочацца». Прыпеўка. **15.** На вяселлі ўсе ... , на хрэсьбінах усе кумаўя (прык.). **18.** Тое, што і завея. **19.** «Іншая жанчына — як ... халодная, але салодкая. А іншая — як боршч гарачая, але кіслая». К. Меліхан. **23.** Марское падарожжа. 24. Невялікая крама (разм.). **25.** ... чалавека — запячатаная кніга (прык.). 26. Цёплыя ... — як пяшчотныя абдымкі (прык.).

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 2. Літаўра. 5. Лекі. 7. Арка. 9. Каханне. 10. Свет. 11. Арыя. 12. Шчасце. 13. Мадам. 14. Ас. 15. Ноч. 17. Розум. 20. Кукла. 21. Вір. 22. Пі. 23. Крылы. 25. Спосаб. 27. Душа. 28. Удаў. 29. Прыродa. 30. Каза. 31. Зіма. 32. Гарчыца. **Па вертыкалі:** 1. Падарунак. 3. Тахта. 4. Ранне. 5. Ласка. 6. Інтым. 8. Крыжачок. 13. Мароз. 16. Сваты. 18. Завіруха. 19. Марожанае. 23. Круіз. 24. Лаўка. 25. Сэрца. 26. Словы.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.40	19.02	11.22
Віцебск —	7.30	18.50	11.20
Магілёў —	7.30	18.52	11.22
Гомель —	7.25	18.50	11.25
Гродна —	7.54	19.17	11.23
Брэст —	7.54	19.19	11.25

Месяц

Маладзік 2 сакавіка. Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. Івана.
К. Катарыны, Францішка, Дамініка.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

9 САКАВІКА

1262 год — заснавальнік і першы вялікі князь ВКЛ Міндоўг заключыў дамову з наўгародскім князем Аляксандрам Неўскім аб сумеснай барацьбе супраць Лівонскага ордэна.

1892 год — 8 сакавіка нарадзіўся (в. Дукора, цяпер у Пухавіцкім раёне) Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў, дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі і СССР. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ў Петраградзе. У лютым—маі 1918 года камісар Беларускага нацыянальнага камісарыята. З ліпеня 1918-га — у Чырвонай Арміі, начальнік аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў; адначасова ў кіраўніцтве Беларускіх секцый РКП(б). У ліку пяці членаў Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі 1 студзеня 1919 года падпісаў Маніфест аб абвяшчэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). У 1919 годзе наркам асветы ССРБ, намеснік наркама асветы Літоўска-Беларускай ССР. 31 ліпеня 1920 года ад імя ЦК КП(б)Б падпісаў Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі. У 1920—1937 гадах — старшыня ЦВК і адначасова ў 1920—1924 гг. — старшыня СНК БССР. З пачатку 1930-х гадоў падвяргаўся неабгрунтаваным абвінавачванням у адыходзе ад генеральнай лініі партыі, яе скажэнні.

1237 год — аб'яднанне Ордэна мечаносцаў з Тэўтонскім ордэнам — заснаванне Лівонскага ордэна.

1497 год — разам з астраномам Даменіка Марыяй Навара Мікалай Капернік правёў першыя астранамічныя назіранні. Пасля гэтага стала ясна, што адлегласць да Месяца, калі ён знаходзіцца ў квадратуры, прыкладна такая ж, як і падчас маладзіка або поўні. Мікалай Капернік сярод сучаснікаў быў вядомы як дзяржаўны дзеяч, добры ўрач і знаўца астраноміі. Ён паспрабаваў удасканаліць геацэнтрычную сістэму свету, выкладзеную Пталемеем, яго сістэму крыштальных сфер, якія круцяцца, і шмат чаго іншага. Для пабудовы сістэмы Пталемея быў выкарыстаны матэрыял тысячагадовых астранамічных назіранняў. Спробы ўдакладнення рабіліся і раней, але Капернік першы звярнуў увагу на падабенства галоўных эпіцыклаў (самы важны складнік траекторыі руху) планет і паспрабаваў знайсці гэтаму тлумачэнне.

1822 год — урач з Нью-Ёрка Чарльз Грэм атрымаў патэнт на штучныя зубы. Іх рабілі ў асноўным з пластмасы, і гэта выклікала сапраўдны фурор у сферы стаматалогіі. Са старажытнасці да нядаўніх часоў пераважная колькасць людзей проста незваротна страчвала зубы, бо «лячэнне» было адно — выдаленне, і толькі вельмі забяспечаныя асобы маглі дазволіць сабе пратэзаванне зубоў, ды і то даволі экзатычнымі спосабамі. Да сярэдзіны XVIII стагоддзя штучныя зубы выраблялiся з костак буйной рагатай жывёлы, зубоў коней, маржоў, слановай косці і прымацоўваліся да суседніх з дапамогай залатога або сярэбранага дроту.

ПУБЛІЙ СІР:
«Дзе адзінства, там заўсёды і перамога».

УСМІХНЕМСЯ

Урач «хуткай», аглядаючы мужчыну:
— Як адбылося няшчасце?
Жонка:
— Ніякага няшчасця. А тое, што патэльня трэснула, — не бяда, новую купім.

Прыйдзеш да сталяра — вакол пілавінне валяецца, да цырульніка — валасы... А прыйдзеш у банк — грошай не відаць. Яшчэ і ручка каля акенца прывязана!

Ветэрынар са студэнтам-стажорам: вучыць яго, як слабіцельныя таблеткі жывёле даваць: — Таблеткі кладзеш сабе ў рот, бярэш трубачку, адным канцом каню ў рот, другім — сабе і дзьмеш! Справа зроблена.

На наступны дзень стажор прыйшоў на тры гадзіны пазней, чым звычайна, увесь бледны, зялёны. — Ты чаго? — пытае ветурач — Конь дунуў першым.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 606. Нумар падпісаны ў 19.30

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

8 сакавіка 2022 года.